*Прачытаў — перадай суседу!*


# СЕРАБРАНКА вольная

МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА НЕЗАЛЕЖНАГА ГРАМАДСТВА

№ 4 (16) красавік 2009



Буйная аварыя на Ракасоўскага *(старонка 2)*

Рамонт па-серабранаўску *(старонка 3)*

Суровы твар беспрацоўя *(старонкі 4-5)*

Апавяданне пра пасляваенныя Шэпічы *(старонкі 6-7)*


# Па кім звоніць чарнобыльскі звон?

**"Чарнобыльскі Шлях" адбудзецца 26 красавіка, збор а 12 гадзіне каля будынка Акадэміі навук. Мяркуецца, што шэсце пройдзе праспектам Незалежнасці да плошчы Якуба Коласа, а адтуль да чарнобыльскай капліцы, што на рагу вуліц Карастаянава і Арлоўскай.**

Імпрэзы пройдуць у абласных цэнтрах Беларусі, а таксама на Астравеччыне. Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў будзе ладзіць прагляд фільмаў на чарнобыльскую тэматыку ў Мінску і рэгіёнах.




МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

## Надзённыя праблемы

З дня катастрофы прайшло ўжо 23 гады, а праблемы, абумоўленыя Чарнобылем, засталіся і сёння. Працэс паўраспаду атамных элементаў цягнецца не адно стагоддзе. Здаецца, беларусы ўжо прызвычаіліся да падвышанага радыяцыйнага фону, з найбольш забруджаных тэрыторый людзей адсялілі. Удзельнікі ліквідацыі наступстваў даўно сышлі ў нябыт. Аднак і зараз у кожнага другога жыхара Беларусі назіраюцца павелічэнні шчытападобнай залозы, нараджаюцца немаўляты з фізічнымі і разумовымі адхіленнямі, моцна церпіць рэпрадуктыўная функцыя.

Мы не можам разгледзець радыяцыю, адчуць яе на смак, памацаць і таму часцяком папросту забываемся пра гэтую небяспеку. Мы мусім штодзень спажываць прадукты з забруджаных тэрыторый. У мінулым годзе Лукашэнка сказаў, што радыяцыі на Беларусі ўжо няма, і ў радыяцыйных зонах пачынаюць аднаўляць гаспадарчую дзейнасць, куды на працу паводле прымусовага размеркавання адпраўляюць маладых спецыялістаў.

## Аварыя можа паўтарыцца!

Беларусам зноў пагражае "мірны атам". Кіраўніцтва краіны прыняло рашэнне будаваць уласную АЭС. Станцыя мае паўстаць на Астравеччыне, у маляўнічым кутку Беларусі, недалёка ад возера Нарач.

Выклікае заклапочанасць і яшчэ адзін факт: АЭС на Беларусі будзе будаваць Расійская кампанія "Росатам". Усе разлікі праекта праведзены на грунце расейскага досведу, які быў атрыманы падчас будаўніцтва АЭС яшчэ за савецкім часам. А гэта значыць, што ў Беларусі можа паўтарыцца другі Чарнобыль з усімі яго наступствамі.

Намеснік старшыні Цэнтра падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятыў Юрась Меляшкевіч выступае катэгарычна супраць будаўніцтва АЭС:

– Гэта небяспечны і авантурны праект, які ажыццяўляецца з парушэннямі беларускага заканадаўства. На сённяшні дзень Беларусі абсалютна не патрэбна атамная станцыя. Каб забяспечыць энергетычную незалежнасць, мы павінны звярнуць увагу на тыя энергетычныя рэсурсы, якімі шчодра надзяліла нас прырода, а таксама дыверсіфікаваць пастаўкі нафты і газу.

## Слова за намі

Ці згодныя на надзвычай дарагі і небяспечны праект беларусы? Шмат хто – не. Але ўлады пачуюць голас народу толькі тады, калі ён аб'яднаецца і гучна заявіць пра гэта. Таму аргкамітэт і запрашае прыйсці на "Чарнобыльскі Шлях–2009" як мага больш беларусаў.

**Майка Раўбіч**

### З гісторыі

**Самая першая акцыя адбылася на трэція ўгодкі Чарнобыльскай трагедыі, 26 красавіка 1989 года. Інфармацыя пра катастрофу замоўчвалася ўладамі, і арганізатары з дапамогай шэсця хацелі прыцягнуць увагу грамадскасці да жудаснай падзеі. Працэсія, пад удары звона, пачалася ад гадзіннікавага завода. Людзі глядзелі з вокнаў дамоў, спыняліся на ходніках. Гандляркі пакідалі прылаўкі і выходзілі на вуліцу. Трыццацітысячны мітынг патрабаваў абнародавання праўды пра Чарнобыль, пакарання вінаватых у замоўчванні вынікаў аварыі ды ліквідацыі яе наступстваў. З таго часу акцыя на 26 красавіка ладзіцца штогод.**

ЗДАРЭННЕ


NN.BY

# Буйная аварыя на Ракасоўскага

**8 красавіка на праспекце Ракасоўскага адбылося дарожна-транспартнае здарэнне: дарогу не падзялілі "Рэно" і "Пэжо". Адзін з легкавікоў збіў жанчыну, якая трапіла ў рэанімацыю.**

Прыблізна а 18-й вечара ў сераду 8 красавіка на праспекце Ракасоўскага адбылося дарожна-транспартнае здарэнне. Ва ўпраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама паведамілі падрабязнасці ДТЗ. Удзельнікамі здарэння сталі мужчына 1977 года нараджэння, кіроўца «Рэно» і мужчына 1986 года нараджэння, кіроўца «Пэжо». Рухаючыся па праспекце Ракасоўскага з боку вуліцы Малініна, легкавік «Рэно» збочыў на перакрыжаванні ў бок кінатэатра «Салют». У гэты момант на дазволены сігнал святлафору тое самае скрыжаванне перасякаў «Пэжо», які рухаўся па праспекце ў накірунку Малініна. У выніку сутыкнення кіроўца «Пэжо» не ўкіраваў, і ягонае аўто вынесла на прыпынак насупраць кінатэатра «Салют». Пры гэтым ён збіў жанчыну 1957 г.н., якая стаяла на ходніку і чакала на зялёнае святло. Жанчыну адкінула ў бок, а «Пэжо» ўрэзаўся ў слуп. Брыгада «хуткай дапамогі» адвезла пацярпелую ў рэанімацыю з адкрытым пераломам левай нагі.

У выніку аварыі па правым баку праспекта ўтварыўся доўгі затор даўжынёй амаль у два кіламетры. Каб вырашыць праблему, супрацоўнікі ДАІ часова пусцілі транспарт па сустрэчнай паласе. Гэта прывяло да яшчэ аднаго сутыкнення – гэтым разам дарогу не падзялілі маршрутнае таксі і легкавік. Але паколькі хуткасць была зусім нязначнай, даішнікі не сталі афармляць яго і адпусцілі кіроўцаў. Затор «рассмактаўся» толькі праз некалькі гадзін.

**Міхась Завадскі**

ЖЫЛЛЁ

# Ці хутка капрамонт?

**У мінулым годзе зрабілі капітальны рамонт у доме № 139 па Ракасоўскага. Завяршаецца капрамонт у доме 101. Хто наступны?**

Жыхары дома 139 па праспекце Ракасоўскага, у якім капрамонт быў распачаты ў 2005 годзе і завершаны праз паўтары гады, не хаваюць свайго задавальнення.

– Аднойчы мы ўбачылі будаўнічыя вагончыкі і запляскалі ў ладкі. У нас у прынцыпе холадна не было. Мянялі трубы, сантэхніку, замянілі вонкавыя рамы на драўляныя шклопакеты, апранулі дом у "тэрмафутра", мадэрнізавалі дах. Уцяплілі, дык зусім добра стала. Градусаў 26 было год таму. Сёлета 22 градусы. Цяпер дом, як цукерка, – кажа пра вынікі капрамонту жыхарка панельнага пяціпавярховіка саракагадовай даўніны.

На вачах прыгажэе дом і дом 101, але хутчэй даводзіцца казаць пра кропкавае вырашэнне праблемы. А што далей? Ці паспяваюць тэмпы капрамонту за ростам колькасці дамоў, якія маюць у гэтым патрэбу? Наш раён характарызуецца наяўнасцю масавай панельнай забудовай пачатку 1970-х гадоў. Надыходзіць час "Х", калі патрэбна гэтак жа масава рамантаваць такія дамы.

КУП ЖЭУ-41 у 2009 годзе першапачаткова планаваў паставіць на капрамонт толькі 7 шматкватэрных дамоў 1970 года пабудовы, што месцяцца на пр. Ракасоўскага (№ 97, 99, 107, 113, 117, 119 і 143). Намеснік міністра камунальнай гаспадаркі Генадзь Ляпуноў запэўніваў на сваёй прэс-канферэнцыі напрыканцы студзеня, што аб'ёмы капітальнага рамонту жыллёвага фонду краіны не зменшацца ў звязку з крызісам (бо і так сціплыя), аднак рэальнасць аказалася іншая. Паводле ЖЭУ, сёлета капрамонт плануецца толькі ў дамах 97, 99 і, магчыма ў 107. Аб'ёмы зменшыліся больш чым удвая!


АРТУР ЛАГОДНЫ

Калі да капрамонту далёка, а жыць узімку невыносна, на дапамогу можа прыйсці цеплавая мадэрнізацыя яшчэ даволі "маладых", але не вельмі якасна пабудаваных дамоў. Многія, мабыць, заўважылі, што даволі сучасныя дамы № 8, 12, 14 па вул. Малініна пачалі абрастаць "тэрмафутрам".

Як высветліла "ВС", у дамах 1985 года пабудовы сапраўды завяршаюць цеплавую рэабілітацыю. Дамы будаваліся Мінскім аўтазаводам паводле чэшскага праекту гаспадарчым спосабам. Завод даваў тэхніку, прыцягваў рабочых будупраўленняў. Дом будаваўся вельмі хутка, каб расселіць рабочых.

– Мы пастаянна пісалі скаргі ў гарвыканкам, у некаторых кватэрах тэмпература зімой апускалася да 12 градусаў. Стыкі паміж панелямі падчас будаўніцтва як след не ўцяплілі. Да нас прыходзілі камісіі, глядзелі тэмпературу, і было прынятае спецыяльнае рашэнне праводзіць цеплавую мадэрнізацыю. Частку сродкаў на гэта выдаткаваў гарвыканкам, частку – Мінжылкамунгас. Трохі таксама паднавілі калідоры (падфарбавалі і памянялі лінолеум). Каб мы не звярталіся ва ўсе інстанцыі, каб не скардзіліся на сваю нядолю ветэраны падчас гадавіны Перамогі, нічога не было б, – распавядае пенсіянер, які пражывае ў доме № 12.

Жыхары заўважаюць, што паводле правілаў, павінны былі памяняць і вокны, аднак гэтага не зрабілі. Але, са словаў жыхароў, нават гэта для іх, як манна нябесная.

**Артур Лагодны**

ЖЫЛЛЁ

# Рамонт па-серабранаўску альбо
## За чый кошт пафарбуюць пад'езды?


АРТУР ЛАГОДНЫ

Алена Бурак

**Рамонт у кватэры – сапраўдная падзея. А калі гэты рамонт капітальны, уражанні ад гэтай падзеі застануцца ледзь не на ўсё жыццё. Колькі мы за гэта заплацім?**

Яшчэ за гады існавання СССР кожны з нас штомесяц пералічваў грошы на капрамонт. Набегла даволі значная сума. Дзе гэтыя грошы зараз? Калі адзін з кандыдатаў у дэпутаты ад нашага мікрараёна заявіў, што будзе дабівацца раскрыцця гэтай таямніцы, у Палату прадстаўнікоў ён ужо не трапіў.

Вось і зараз кожны месяц у радку "капрамонт" нашых "жыровак" мы бачым немалыя грошы. Куды яны ідуць? Адрамантаваныя адзінкавыя дамы. Ці дачакаюцца жыхары нашых саракагадовых панэльных "брэжневак", якімі масава забудаваная Серабранка, замены вокнаў, трубаў, уцяплення будынкаў і дахаў?

З надзвычай арыгінальнай ініцыятывай выступіла ЖРЭУ-41. У шматкватэрным доме № 145 па Ракасоўскага камунальшчыкі прапанавалі жыхарам касметычны рамонт за кошт… саміх жыхароў. Супрацоўнікі ЖРЭУ паведамілі, што рамонт пад'езда будзе каштаваць 9 мільёнаў рублёў. За кошт сродкаў, акумуляваных ЖРЭУ, будуць пафарбаваныя сцены і столь першага паверха, аднаго маршу лесвіцы (а дом 9-ціпавярховы!) і заменены панэлі на лоджыях з боку праспекта. Паводле ідэі камунальшчыкаў, жыхары мусяць дадаткова скінуцца па 230 тысяч рублёў з кожнай кватэры.

Людзі былі справядліва абураныя. Узнікла думка пісаць калектыўны зварот да кіраўніка мінскіх уладаў. Нехта прапанаваў набыць самастойна той фарбы і наняць маляроў. Тады выдаткі складуць 50 тысяч з кватэры. Чаму такой дарагоўляй вызначаюцца жэсаўскія паслугі і чаму камунальшчыкам так карціць пафарбаваць пад'езды серабранаўскіх дамоў, ды яшчэ за кошт жыхароў (касметычны рамонт раптам кінуліся рабіць у шмат якіх жылых дамах)? Гэта наводзіць на цікавыя думкі. Няўжо ў ЖЭСах не стае гаспадарлівых людзей, якія б разумелі, што такі рамонт – марнатраўства грошай? Нават у Евангеллі ад Мацвея напісана, што няма сэнсу ставіць новыя латкі на старое адзенне: усё роўна парвецца.

Такое ўражанне, што нашы ўлады хочуць ператварыць краіну ў палігон для прыхарошвання. Вялізныя сродкі ўкладаюцца ў тое, каб усё добра выглядала, а не ў рэальнае паляпшэнне ўмоў для жыцця грамадзян. Нібыта галоўнае значэнне надаецца форме, а не зместу, каб пацешыць вока высокаму і грознаму начальніку.

### Каментар эксперта:

**Пракаментаваць сітуацыю пагадзіўся кіраўнік аргкамітэту ў стварэнні Беларускай партыі свабоды і прагрэсу, былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў, які даследаваў праблемы ЖКГ Уладзімір Навасяд.**

**– ЖЭС не павінен рамантаваць пад'езды за кошт дадатковага прыцягнення сродкаў жыхароў, бо лесвічныя пляцоўкі не з'яўляюцца ўласнасцю насельнікаў шматкватэрнага дома. Магчыма, цяпер шмат дзе ініцыяваны касметычны рамонт, таму што на правядзенне своечасовага капітальнага папросту няма грошаў. А работнікам ЖЭСаў трэба плаціць заробак. Вось і займаюцца імітацыяй добраўпарадкавання, – кажа Уладзімір Навасяд.**

**Атрымліваецца, што грошы, якія жыхары штомесяц адлічваюць на капрамонт, зноўку кудысьці "выпарыліся"? Мо яны былі скарыстаныя не па мэтавым прызначэнні? Пра гэта застаецца толькі гадаць.**

ФОТАФАКТ


ЮРАСЬ НАВІЦКІ

Лошыцкая рэканструкцыя

СОЦЫУМ

# Схаваўшы праблему, яе не вырашыш

**Мінскае беспрацоўе. Яго вытокі, дынаміку і асаблівасці даследуе Міхал Жук**

### Чаму лічбы розныя

У часы кіравання камуністычнай наменклатуры гэткай ганебнай з'явы – беспрацоўя, разам з кілбасой, сэксам і шмат яшчэ чым, у "БССР" папросту не існавала. Сёння ў суверэннай Беларусі афіцыйны ўзровень беспрацоўя ізноў жа нікчэмна нізкі – усяго 0,9%. Але, паводле выдання Навукова-даследчага інстытута міністэрства эканомікі "*Экономический бюллетень*", беспрацоўе ў Беларусі, калі яго разлічваць паводле метадалогіі Міжнароднай арганізацыі працы, дасягае 4,8% ад эканамічна актыўнага насельніцтва. Да таго ж, ужо 6-га сакавіка ў тым жа міністэрстве эканомікі на паседжанні рабочай групы было агучана, што ва ўмовах крызісу прыхаванае беспрацоўе ў Беларусі дасягнула блізу паўмільёна чалавек. Гэтая лічба болей нават за разлічаную МАП і азначае, што сапраўдны ўзровень беспрацоўя ў краіне недзе ў 6 разоў вышэйшы за афіцыйны паказчык. Розніца ў лічбах тлумачыцца тым, што "лішнія людзі" з прычыны адсутнасці рэальнай дзяржаўнай дапамогі шукаюць працу самастойна, ігнаруючы пастаноўку на ўлік. Прычыны – мізэрнасць дапамогі, неабходнасць адпрацоўкі на "брудных" грамадскіх работах, а таксама юрыдычная нікчэмнасць накіраванняў біржаў на працу.

### Сціплая сталічная статыстыка

Сапраўдную лічбу беспрацоўных мінчукоў высветліць сталася даволі складана. Чыноўнікі сцвярджаюць, што ўзровень беспрацоўя амаль такі ж, як у мінулым годзе. Летась у Мінску, паводле афіцыйных звестак, колькасць беспрацоўных дасягала 3,7 тысяч чалавек.

Інспектары аддзела працаўладкавання нашага раёна прызнаюць павольны рост беспрацоўя пры адначасным памяншэнні колькасці прапанаваных вакансій, але дакладнай інфармацыі не даюць.

> *Як сцвяржае выдадзены на пачатку дзевяностых савецкі энцыклапедычны слоўнік, беспрацоўе ёсць "сацыяльна-эканамічнаю з'яваю, уласцівай капіталізму, пры якой частка эканамічна актыўнага насельніцтва ня можа ўжыць сваю працоўную сілу, становіцца "залішняй".*

Намеснік старшыні камітэта працы, занятасці і сацыяльнай абароны, начальнік ўправы занятасці Мінгарвыканкама Чэслаў Роўба на паседжанні "круглага стала" ў Мінску 20 сакавіка паведаміў што назіраецца "тэндэнцыя павелічэння колькасці людзей, якія рэгіструюцца ў аддзелах працаўладкавання." Чыноўнік даў зразумець, што без працы застаюцца як правіла слабаабароненыя катэгорыі грамадзян. "Шэраг прадпрыемстваў, у тым ліку буйных, паменшылі колькасць вакансій, якія падаюць у службу занятасці, у сувязі з аптымізацыяй штатнага раскладу і з іншых чыннікаў", – заўважыў Роўба. Пры гэтым "рэзка павялічылася колькасць зваротаў да нашай базы інфармацыі аб вакансіях – рост прыкладна на 40%", – канстатаваў чыноўнік.

Паводле звестак, пададзеных Мінгарвыканкамам, колькасць беспрацоўных на 13 сакавіка бягучага года ў параўнанні з пачаткам года вырасла на 23% і склала 4,7 тыс. чалавек, пры гэтым колькасць заяўленых вакансій знізілася да 14,5 тыс., або на 17%.

### Хаўрус крызісу і дрэннага начальства

26 сакавіка на кірмашы вакансій, што ладзіў Мінгарвыканкам у ДК чыгуначнікаў, было не прапіхнуцца нават а дванаццатай. Праблема абвастрылася не толькі пад уплывам сусветнага крызісу. Адбіліся такія непапулярныя захады сталічных чыноўнікаў, як леташняе пазбаўленне працы прадаўцоў і гаспадароў соцень шапікаў на прыпынках грамадскага транспарту Мінска, а таксама скарачэнне з прычыны жорсткай манетарнай палітыкі ўрада, гандлёвых аб'ектаў і забарона дробным прадпрымальнікам наймаць на працу несямейнікаў. Прадпрымальнікі, дарэчы, дакляравалі міністэрству эканомікі забеспячэнне працаю 70 тысячаў чалавек.

### "Урад абсалютна не рупіцца аб нас!"

"З нас папросту здзекуюцца, каб мы не хадзілі на тую біржу." – "Хочаш змяніць прафесію – ідзі паўгады вучыся на іхніх курсах са "стыпендыяй" 40 тыс.! Мы ж не дзеці, у нас саміх дзеці!" – "У краіне праблемы беспрацоўя афіцыйна не існуе, таму няма дзейных антыкрызісных праграм, якія б абаранялі правы беспрацоўных". – "Хаця б плацілі мінімальны заробак, людзі ж невінаватыя. А то даюць 35 тысячаў – кармі сям'ю…" –"Нават на кватэрную тплату гэтай драбязы не выстарчыць, нават на праязныя, каб працу шукаць!"– гэтак адгукаюцца беспрацоўныя аб захадах, якія робіць урад для вырашэння іхняй асабістай і агульнанацыянальнай праблемы.

ПАРТНЁРСКАЯ РЭКЛАМА




Не забывайцеся, што pdf-версію Вашай газеты магчыма спампаваць у Інтэрнэце:
**http://kamunikat.org/volnaja_sierabranka.html**
Адрас сайта газеткі **http://serabranka.at.tut.by**
Свае допісы дасылайце, калі ласка, на скрынку
**serabranka@tut.by**



# Адзін дзень з жыцця сярод звяроў і птушак

Чым ёсць грамадскія работы для мінчукоў, даследаваў на сабе наш карэспандэнт **Юры Рыжкаў**. Ён у якасці беспрацоўнага атрымаў накіраванне ў мінскі заапарк.

### Звяры, кветкі і яблыкі



У сакавіку з нашага раённага аддзела працаўладкавання накіроўвалі толькі туды. За працу ў заапарку налічваюць па 12 тысячаў за дзень, якія можна атрымаць праз 2-3 тыдні. Несумненны плюс – блізкасць да Серабранкі. Хаця, як высветлілася, пасылаюць сюды адпрацоўваць мізэрную дапамогу з усіх раёнаў Мінска.

У красавіку для безпрацоўных Ленінскага раёна арганізуюцца грамадскія работы таксама ў батанічным садзе і на мінскім гуртовым рынку за горадам. Але на апошні зараз не ўбіцца праз вялікую колькасць ахвотных: там за два дні працы плацілі 30 тысяч, а таксама дазвалялася набраць пабітых яблыкаў.

### Парк – рэжымны аб'ект?

Апрануўшыся ў адпаведнасці з сітуацыяй (то бок далёка не ў лепшае), а восьмай раніцы з'яўляюся ў аддзел кадраў заапарку. Наталля Іванаўна, якая загадвала размеркаваннем работ, спачатку дае справу паводле спецыяльнасці – дапамагаць электрыку. Аднак электрыка Славу насцярожвае фотакамера. Хвілінка – і Слава ўжо бяжыць з дакладам да кіраўніцтва, а яшчэ праз некалькі хвілін мяне пераводзяць збіраць смецце за агароджай, падалей ад тэрыторыі. Што за сакрэты хаваюцца ў заапарку ад грамадскасці, і калі гэта ён стаў рэжымнай зонай – уцяміць не магу.

### Прыборка знешніх тэрыторый

Новае месца працы аказалася пляцоўкай тусоўкі чыжоўскіх выпівакаў. Падыходзяць па двое, па трое, адкаркоўваюць. П'юць стоячы. Паколькі яшчэ не вечар, сыходзяць, пакідаючы пасля сябе вагон смецця. Я частку палю, а два вялізныя мяхі пластыкавых пляшак заношу да сметніцы. Затое вольнаму-воля – хочаш, сядай на пянёк ды бі лынды да абеду.

### Вольны час – абед і тэхнічныя перапынкі

Тут аніякіх абмежаванняў няма. Таму вольны час я прабавіў з вялікім задавальненнем і нават карысцю: хуценька перакусіўшы, агледзеў і атракцыёны, і звяроў з птушкамі. У парку ёсць ваўкі і мядзведзі, казулі і алені, дзікі і зубры, лісы і яноты. Было шмат мясцовых і экзатычных птушак. Я атрымаў магчымасць зрабіць некалькі здымкаў. Хоць насельнікаў заапарку кормяць, амаль ніхто з іх ад дэсерту не адмовіцца, таму, калі надумаеце пайсці ў заапарк, асабліва з дзецьмі, мае сэнс захапіць пару памытых морквін.

### "Жахі нашага горадка"

Наведнікі аддзела працаўладкавання распавядаюць страшылкі, што з мэтаю памяншэння прытоку рэгістраваных беспрацоўных біржа працы адмыслова накіроўвае тых "адпрацоўваць грашы" на выграбную яму. Інспектарка мяне запэўніла, што нічога такога не будзе, там клеткі рамантуюць і г.д. Што такое "г.д.", я даведаўся, апынуўшыся пасля абеду на гэтай самай яме. Нічога жудаснага, гной як гной, калгаснікі кожны дзень з гэткім сутыкаюцца. Адно бывае кепска тым, хто прыходзіць на адбыццё павіннасці ў лакаваных ботах. Мае ж, гумовыя, бруду не баяцца – рэчачка памыла, сонейка прасушыла. І на сэрцы пацяплела, гледзячы на звяроў ды на вынікі сваёй працы: а як жа, за двухногімі смецце прыбраў, за чатырохногімі гной адкінуў. А праз месяц яшчэ атрымаю, як кажуць самі беспрацоўныя, "на бутэльку гарэлкі і на пачак пельменяў ды цыгарэт".





### Парады ад Юрася

**У заапарк апранацца трэба адпаведна. Прыкра глядзець, як маладзіца ў навюсенькай чырвонай марынарцы ці дзяўчына, прыфранціўшыся ў святочнае, у стаўбунах пылу мятуць ходнікі. Інвентару ўсім ахвотным папрацаваць на карысць двух- і чатырохногай грамады можа бракаваць, бо бываюць дні, калі колькасць беспрацоўных у заапарку налічваецца дзесяткамі. Могуць спатрэбіцца калок для натыкання смецця і гумовыя пальчаткі ці рабочыя рукавіцы.**

ПРОЗА

**Доктар з адукацыі, Уладзімір Бунімовіч нарадзіўся і гадаваўся ў Мінску. У 1991 годзе пераехаў у Ізраіль. На гістарычнай радзіме давялося нялёгка: першыя гады працаваў вартаўніком, мыў пад'езды і самаадданна вывучаў мовы – іўрыт, ангельскую. Асвойваў ізраільскую медыцыну. У свае амаль 60 гадоў атрымаў ліцэнзію і змог працягнуць сваю лекарскую практыку. Цяпер Уладзіміру 74 гады. У яго ёсць дзеці і ўнукі. Апавяданне (аўтарская назва – "Суіцыд") пра выпадак з ягонай практыкі, які здарыўся на пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя ў серабранскіх Шэпічах, друкуецца з ласкавай згоды аўтара ўпершыню.**

# Як у Серабранцы нябожчыка ратавалі

Уладзімір Бунімовіч

Зноў памяць вяртае мяне ў часы ўжо такой далёкай маладосці...

Пасля абавязковай трохгадовай працы ў правінцыі, у пачатку шасцідзесятых я вярнуўся ў Мінск. У гэтым горадзе я нарадзіўся, вучыўся ў школе, закончыў медыцынскі інстытут, адсюль з'ехаў паводле размеркавання, і трапіць назад было няпроста. Пашчасціла, што ў гэтыя гады служба па барацьбе з сухотамі пашыралася, пабудавалі новы стацыянар, дзе знайшлося месца і для мяне.

У Мінску ў нас заставалася кватэра, дзе жыла мая маці, і куды не без праблемаў мы прапісаліся назад. Жонка ўладкавалася на "хуткую дапамогу" (мы заканчвалі разам інстытут), дзіцёнак хадзіў у садок. Здавалася, можна жыць і працаваць спакойна. Але – грошай катастрафічна не ставала. Давялося шукаць сумяшчальніцтва, і яно знайшлося – на "хуткай дапамозе". На гэтым месцы, адначасна з асноўным заняткам, я прапрацаваў шмат гадоў.

Літаральна ў першыя дні, летнім нядзельным вечарам, атрымліваю выклік: "Засіліўся". У практыцы працы "хуткай дапамогі" – гэта адна з самых непрыемных нагодаў да выезду.

Нашай брыгадзе не пашчасціла тройчы: тыя, хто засіліўся, амаль у ста працэнтах выпадкаў не дажываюць да прыезду доктара, калі не дастаць з пятлі і не аказаць дапамогу цягам трох — пяці хвілін. Тым, хто засіліўся, я ніколі раней дапамогу не надаваў, і як праводзіць рэанімацыю, уяўляў сабе вельмі цьмяна. Дый тэрміну такога ў той час, здаецца, не было.

Мой асістэнт, чырванатвары фельчар гадоў 55-ці, з масіўнай патыліцай, толькі што выйшаў у адстаўку з войска. Пра медыцыну ўвогуле і пра экстраную дапамогу ў прыватнасці, з ягоных слоў, не ведаў амаль нічога. Яго службовыя абавязкі палягалі ў першай далекарскай дапамозе пры сіняках і драпінах і ва ўжыванні казённага спірытусу, да якога ён быў вельмі ласы.

Ды рабіць няма чаго – трэба ехаць! Шлях быў няблізкі – на ўскраіну Мінска, дзе размясціўся стыхійна ўзрослы пасёлак Шэпічы з неафіцыйнай назвай Вялікі Шанхай.

Там былі старыя баракі, дзе пасля вайны трымалі палонных немцаў. Немцы з'ехалі дадому, а баракі засталіся. Да іх прыляпіліся нейкія неверагодныя прыбудовы, прыбіральні тыпу "халодная рэтырада", там жа – хлеўчукі для дробнай жыўнасці з абрэзкаў дошак, кавалкаў бляхі і іншых падручных матэрыялаў. Натуральна, вуліцы не мелі назваў, на дамах не было нумароў, праехаць да будынкаў было немажліва, асвятлення не існавала. Часам, паводле чутак, там знікалі людзі.

Зазвычай асноўны час выкліку быў заняты пошукамі патрэбнага дома. Быў побач і Малы Шанхай, пасёлак такога ж тыпу, і іх заўсёды блыталі.

Ужо было цёмна, калі мы наблізіліся да "жылога масіву". Пад'язджаючы, заўважылі шматлікіх сустрэчных. Красамоўнымі жэстамі нам паказвалі кірунак да месца дзеяння, і мы зразумелі, што справа дрэнная.

Праехаўшы трохі далей, мы пабачылі агромністы натоўп, чалавек 200 – 250, і вымушаныя былі спыніцца.

Аўтамабіль атачылі разгарачаныя п'яныя людзі, яны літаральна вынеслі нас вонкі. Выцягнулі насілкі і груваcткі дыхальны апарат, надоечы прыдбаны адміністрацыяй адмыслова для такіх выпадкаў (рэанімацыйных брыгадаў тады яшчэ не існавала, і ўсе выклікі закрывалі выяздныя лекары).

Мы паспяшалі ў цэнтр натоўпу, які суправаджаў нас густой лаянкай.

Чуліся асобныя выгукі:

– Лайдакі!

– Тут чалавек памірае, а вы, пэўна, дзевак ціскаеце!

– Па смерць дасылаць!..

– Хутчэй дапамогу аказвай, жыдоўская пыса! (Як яны ў цемры вызначылі маю нацыянальнасць, для мяне застаецца загадкай і цяпер!)

– Не замінай, няхай доктар агледзіць!..

– Даць у лыч, каб хутчэй рухаўся!..

Наш патрапаны "лімузін" пад'ехаў бліжэй, і кіроўца асвятліў фарамі месца падзей.

Я падышоў і пабачыў труп. Так, труп маладзёна, бледны, з сінімі вуснамі. Шырокія зрэнкі расплюшчаных вачэй глядзелі ў пустэчу. На шыі – ясна бачная странгуляцыйная баразна.

Над целам шчыравалі два п'яныя энтузіясты, робячы нешта кшталту штучнага дыхання. Побач разбэрсаная маладзіцца заходзілася ў гістэрычным плачы.

– Калі гэта адбылося? – спытаў я, прысядаючы на кукішкі перад целам.

– Ды ўжо хвілін сорак прайшло, – адказалі з натоўпу.

Пульс на соннай артэрыі я не намацаў, тоны сэрца не праслухоўваліся, дыхання не было.

Я ведаў, што ў тым выпадку, калі знаходзяць чалавека, які памёр да прыезду "хуткай", доктар абавязаны паведаміць пра гэта міліцыі і заставацца на месцы да прыбыцця афіцыйных асобаў.

Але аб'явіць, што чалавек памёр, у гэтай сітуацыі я не мог. Мяне тут жа знішчылі б разам з фельчарам, насілкамі, дыхальным апаратам і скрыняй з лекамі!

Па-першае, мы прыехалі з вялікім

спазненнем. Па-другое, жонка працягвала біцца ў гістэрыцы, правакуючы натоўп на агрэсію. Па-трэцяе, мы былі акружаныя п'янымі людзьмі, якія ставіліся да нас варожа і якія былі ўзрадаваныя ў гэты вечар нечаканай прыгодай у іх нудотным жыцці. Усё гэта імгненна пранеслася ў маёй галаве. Падняўшыся, я гучна сказаў:

– Пульс ёсць! Павязем у шпіталь! Усім адысці! Жонка няхай едзе з намі, астатнія разыдзіцеся, дайце хвораму паветра! Дапамажыце ўзняць насілкі, – скамандаваў я.

Падключыў дыхальны апарат, дзе, на ліха, манометр паказаў мала кіслароду, да таго ж, унутры нешта зашыпела.

Фельчару я гучна загадаў:

– Кафеін, адрэналін у вену!

Зрабіў ін'екцыю нібыта ў вену, або ўвогуле паўз яе. Уключылі сірэну і ад'ехалі праз пацішэлы натоўп.

Цяпер ужо было лягчэй, мы мелі справу толькі з жонкай, якая нечакана хутка супакоілася.

Па дарозе я яшчэ раз агледзеў цела, пераканаўся, што труп ёсць труп, і асцярожна распачаў гаворку з жанчынай.

– Як гэта ўсё здарылася?

– Апошнім часам мы сварыліся. Піў ён не прасыхаючы, з працы яго звольнілі, грошай не прыносіў. Я адна працую, дык ён і мой заробак прапіваў! Сёння я сказала яму: "Досыць ужо, ідзі працуй, грошай няма, на самагонку табе не дам!" Ён палез біцца.

Я дала яму ў пысу (яна паказала сіняк пад левым вокам) і, даруйце, доктар, кажу: "Ты і працаваць не хочаш, і як мужык ні на што не здатны, не стаіць у цябе! Якога чорта ты мне трэба! Ідзі прэч, куды хочаш!"

Ён змоўк, сышоў, пацішэла. Пасля чую шум, нешта ўпала, выйшла на двор – а ён у хлеўчыку вісіць!

Хацела зняць – цяжкі, не здужала. Хацела паклікаць суседзяў – усе п'яныя ў покат ляжаць. Пабегла далей, пакуль прыйшлі, пакуль знялі...

– Колькі ён вісеў?

– Хвілінаў дзесяць, дваццаць...

Мы пад'язджалі да другой клінікі.

– Зараз мы прыедзем, але, напэўна, яго не ўратуем, доўга вісеў...

– Бачу я ўжо...

На скуры выразна праступілі трупныя плямы. Чаму не развярнуўся, не павёз яго ў міліцыю, як трэба было – не ведаю і цяпер. Спадзяваўся, што ўсё ўтрасецца само сабой. Не ўтрэслася...

Спыніліся перад прыёмным пакоем. З дапамогай жонкі памерлага і пары мінакоў занеслі насілкі. Пры слове "засілены" праз хвіліну выйшла доктарка, мажная энергічная жанчына з цыгаркай у зубах. Паглядзела на шырокія зрэнкі, пабачыла трупныя плямы на твары і шыі. Не кранаючы цела памерлага, характэрным рухам уперла рукі ў бокі і гучна запытала:

– Доктар, каго вы мне прывезлі?

– Засіленага... – адказаў я нерашуча.

– Мілы доктар, – здзекліва паўтарыла яна. – Вы прывезлі мне труп!

Жонка памерлага нясмела паспрабавала загаласіць...

– Ён мёртвы ўжо болей за дзве гадзіны! Вы бачыце трупныя плямы?

Я паспрабаваў адвесці яе ў бок:

– Я бачыў, што ён ужо мёртвы...

– Калі бачылі, то навошта везлі яго? Трэба было выклікаць міліцыю!

– Разумееце, там было болей за дзвесце чалавек...

– Я ўсё разумею, але забірайце труп і звозьце адсюль!

– Зараз я патэлефаную на цэнтр...

Старшы лекар скеміў адразу.

– Забірайце труп без размоваў і вязіце ў міліцыю па месцы жыхарства. Там возьмеце накіраванне на судмедэкспертызу і адвязеце труп у трупярню. І варушыцеся хутчэй!

Санітары прыймовага пакоя занеслі труп назад у машыну. Я зноў звязаўся з дыспетчарскай і папрасіў даведацца, якое аддзяленне міліцыі абслугоўвае Шэпічы. Праз хвіліну мне адказалі: "Вязіце ў міліцыю Мінскага раёна". Мы паехалі.

Жонку памерлага я пакінуў у прыймовым пакоі, параіўшы ёй самастойна дабірацца дахаты. Як выявілася, я пазбавіў яе далейшых нягодаў.

Праз хвілін сорак прыехалі. Дзяжурны лейтэнант падрабязна распытаў, дзе мы ўзялі труп, некуды патэлефанаваў, нечаму ўзрадаваўся і весела аб'явіў:

– Не наш!

– Як не ваш?

– А вось як! Калі б вы ўзялі яго ў Малым Шанхаі – вось той наш, раённы. А з Вялікага Шанхая – не наш, а гарадскі! Вязіце ў дзесятае аддзяленне. Доктар, не забудзься сказаць, што мярцвяк з Вялікага Шанхая.

Узброеныя новымі ведамі ў тапаграфіі, павезлі наш груз праз увесь горад. У гарадскім аддзяленні не гледзячы нам выпісалі патрэбнае накіраванне, і мы паехалі ў гарадскую судмедэкспертызу.

Па дарозе кіроўца заявіў:

– Доктар, бензін заканчваецца!

На бліжэйшай запраўцы – чарга з дзесяткаў аўтамабіляў. Па правілах санітарны транспарт абслугоўваюць без чаргі, і мы паехалі да калонкі.

– Куды прэш! – пачулася некалькі галасоў.

Наш кіроўца крычыць:

– Прапусціце, мы тэрмінова хворага вязем!

– Нічога, не памрэ!

Адзін зазірнуў у вакенца.

– Браткі, ды яны мерцвяка вязуць!

– Што, памёр ужо?!

Некалькі чалавек, пераканаўшыся, што вязуць не жывога хворага, а труп, закрычалі:

– Не прапусцім, мярцвяк пачакае!..

Нарэшце заправіўшыся, паехалі ў гарадскую экспертызу. Але выявілася, што дзяжурны, які выдаў нам накіраванне, забыўся, што па выхадных экспертыза не працуе! Натыкнуўшыся на агромністы замок, я сказаў:

– Досыць, паехалі ў абласную, яна ў анатамічным корпусе мединстытута, гэта побач.

Пабачыўшы накіраванне ў гарадскую трупярню, дзяжурны, малады чалавек, сказаў: "Гэта не да нас, гэта ў гарадскую экспертызу!"

Усё, кола замкнулася!

На шчасце, дзяжурным быў студэнт-шасцікурснік, мой колішні знаёмы за альпінісцкай секцыяй.

– Марык, гэта ты?

– А, Валодзя, здарова!

Я сцісла распавёў яму пра нашыя прыгоды.

– Ладна, згружай свайго кадаўра, прыму...

Мы выехалі ў 19 гадзін, а вярнуліся глыбокай ноччу, і тут жа атрымалі выклік на інфаркт...

*Пераклала з рускай*
*Віка Трэнас*

СМІ

# Вольнае слова: Шукайце ў шапіках

Прызнаемся шчыра, пэўнасці ў тым, што мы ўбачымся з Вамі ў бліжэйшы час, шаноўны чытач, няма. Таму мы вырашылі зарыентаваць Вас у пошуках незалежнага друкаванага слова. Калі пастарацца, цалкам магчыма адшукаць даволі цікавыя недзяржаўныя СМІ нават у серабранскіх шапіках "Белсаюздруку".

## Наша Ніва

Гэта шмат у чым унікальны выдавецкі праект. Газета была заснаваная ў 1906 годзе ў Вільні і адноўленая ў 1991-м. Доўгі час друкавалася тарашкевіцай і была арыентаваная на вузкае кола нацыянальнай інтэлігенцыі. У мінулым годзе перайшла на сучасны, зразумелы практычна ўсім жыхарам Серабранкі правапіс. Выходзіць штотыднёва, у сераду. Паралельна з папяровым выданнем існуе Інтэрнэт-сайт газеты nn.by.

Маладая сваім аўтарскім калектывам, "Наша Ніва" піша пра ўсе аспекты сённяшняга беларускага жыцця — палітыку, гаспадарку, культуру, крымінал, здарэнні, на яе старонках можна прачытаць меркаванні вядомых людзей з нагоды галоўных тыднёвых падзеяў, а таксама дасціпныя і густоўныя фельетоны і жарты.

"НН" заўжды была выданнем грамадскім і ніколі не трапляла пад кантроль аўтарытарнай ці таталітарнай улады. Ва ўсе перыяды існавання газеты на яе старонках прапаноўваліся і дыскутаваліся культурныя мадэлі, якія дапамагалі беларусам станавіцца сучаснай нацыяй.

## Народная Воля

Папулярнае ў апазіцыйных колах перыядычнае выданне, якое выходзіць 2 разы на тыдзень. Газета вядомая перадусім сваім легандарным галоўным рэдактарам Іосіфам Сярэдзічам, які паслядоўна і абгрунтавана крытыкуе на старонках свайго выдання аўтарытарны рэжым, што існуе ў Беларусі апошнія 14 год, і яго негатыўныя наступствы для эканомікі, палітычнага і грамадскага жыцця.

Тым не менш, у газеце акрамя надзённых каментароў заўсёды багата бесстаронняй інфармацыі і эксклюзіўных журналісцкіх даследаванняў, за што выданне мае шырокі спектр сталых чытачоў ад сябрыаў КХП-БНФ да насельнікаў Карла Маркса, 38. Не саромяцца даваць свае каментары "Народнай Волі" высокапастаўленыя беларускія чыноўнікі і знаныя спартоўцы, што сведчыць аб несумненнай павазе да гэтага СМІ.

Інтэрнэт-сайт газеты месціцца па адрасе nv-online.info.

## Новы Час

Гэта даволі малады выдавецкі праект, якім кіруе вельмі дасведчанны і абазнаны ў беларускай гісторыі чалавек з сацыял-дэмакратычнымі поглядамі Аляксей Кароль.

На старонках газеты шмат увагі надаецца праваабарончай тэматыцы, міжнароднай палітыцы і палітычнаму жыццю краіны, экалагічным праблемам, гістарычна-культурнай спадчыне беларусаў.

Газета, заснаваная Мінскай арганізацыяй Таварыства беларускай мовы, сягае ў сваёй тэматыцы значна шырэй за моўныя пытанні.

Пакуль што ў шапіках яе знайсці няпроста, але без праблемаў яе можна прыдбаць (дарэчы, як і іншыя незалежныя газеты) у сядзібе ПБНФ на Машэрава (былая Варвашэні), 8. Газета прадстаўлена ў Інтэрнэце на адрасе novychas.org

Калі пашанцуе, у пунктах "Белсаюздруку" можна набыць такія незалежныя выданні, як "**Свободные новости+**", «**Белорусы и рынок**», «**Белорусскую газету**», «**Национальную экономическую газету**». Мы рэкамендуем з імі азнаёміцца тым, каму з цяжкасцю даецца чытанне на роднай мове, альбо тым, каго цікавіць спецыфічная тэматыка. Таксама памятайце, што ў наш час не варта абсалютна давяраць напісанай інфармацыі. Значна лепей пазнаёміцца з некалькімі крыніцамі, асэнсаваць іх і зрабіць свае высновы.

КОНКУРС

# Срэбраная зорка:

## Фотаконкурс вясновых дзявочых усмешак працягваецца!



Падведзены вынікі 1-га этапу завочнага фотаконкурсу прыгажосці, абвешчанага месяц таму рэдакцыяй "ВС".

Мусім зазначыць, што перад рэдкалегіяй паўстала няпростая задача: выбраць з прыгожага найпрыгажэйшае. Тым не менш…

Пераможцай фотаконкурсу за сакавік, стала жыхарка Серабранкі Даша. Яе ўсмешка наўрад ці каго можа пакінуць абыякавым, а яе цудоўнае валоданне беларускай мовай чарговы раз пацвердзіла тэзу, што беларускія дзяўчаты – самыя прыгожыя ў свеце.

Шчыра віншуем Дашу з перамогай і з задавальненнем размяшчаем яе фотаздымак на старонках "ВС".

Астатніх дзяўчат заклікаем дасылаць свае фота (не болей за 1 Мб) на мэйл **serabranka@tut.by**

Мясцовае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне "Вольная Серабранка"
Выдавец і заснавальнік – супольнасць дэмакратычных актывістаў Ленінскага раёна г. Мінска.
Друкуецца пры падтрымцы ЦВІ г. Мінска.
За змест матэрыялаў адказваюць аўтары.

Галоўны рэдактар – Артур Бацькавіч Лагодны.
**Пры выкарыстанні матэрыялаў і фотаздымкаў "ВС" спасылка абавязковая!**
Газета выдаецца на беларускай мове сучасным правапісам
Капіяванне газеты і распаўсюд сярод сваякоў і знаёмых вітаецца.

Рукапісы дасланыя ў рэдакцыю не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Інтэрнэт-старонка: http://serabranka.at.tut.by
Рэдакцыйны інтэрнэт-адрас: serabranka@tut.by
Адрас для карэспандэнцыі:
*Мінск, Машэрава, 8 (Управа ПБНФ), для рэдактара "ВС"*

Рэдакцыйны тэлефон: (8-029)9625143
**РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА БЯСПЛАТНА**
Наклад 299 экз. (дадатковы 1). Замова № 49.
Падпісана да друку ў 0:58 20.04.2009 г.